4. *Санько, З.* Факсімільнае выданне першай масавай беларускай дэмакратычнай газеты «Наша Ніва» [Электронны рэсурс] / З. Санько // Беларуская палічка. – Рэжым доступу: https://knihi.com/none/Nasa_Niva_zip.html. – Дата доступу: 09.05.2022.

5. *Толстая, С. М.* Деды в полесском народном календаре. Балто-славянские этнокультурные и археологические древности. Погребальный обряд / С. М. Толстая. – М. : Ин-т славяноведения и балканистики РАН, 1985. – 81 с.

6. *Шмыгалёў, Я.* Курапаты: дарога смерці / Я. Шмыгалёў, З. С. Пазняк // Літаратура і мастацтва. – 1987. – № 11.

7. *Щирый, Т.* Старое Палессе, якога вы не бачылі [Электронный ресурс] / Т. Щирый // Onliner. – Режим доступа: https://people.onliner.by/2021/12/09/staroe-palesse-yakoga-vy-ne-bachyli. – Дата доступа: 09.05.2022.

УДК 94(368):(316.7+572)

**Ю. С. Барадзін,**
*аспірант кафедры культуралогіі*
*ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў», Мінск*

# КУЛЬТУРА ВІКІНГАЎ ЯК ПРАДМЕТ ВІЗУАЛЬНАЙ АНТРАПАЛОГІІ

Паказаць ролю традыцыйнай культуры вікінгаў у візуальнай культуры і ў кантэксце яе адраджэння і вяртання ў сучасную культуру. Аб’ектам даследавання з’яўляюцца вікінгі ў візуальнай антрапалогіі. У публікацыі аўтар звяртаецца да навуковай і мастацкай літаратуры, да інтэрнэт-спасылак пра вікінгаў у візуальнай антрапалогіі, у якой вікінгі працягваюць адыгрываць ролю ў фотаздымку, кіно, рэкламе, мастацтве. Дадзенае даследаванне можа выступаць асновай для правядзення далейшых даследаванняў.

**Ключавыя словы:** вікінгі, візуальнае, антрапалогія, мастацтва, культура, багі, героі, персанажы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Y. S. Baradzin,**
*Post-graduate student of the Department of Cultural Studies of the Education Institution “Belarusian State University of Culture and Arts”, Minsk*

# VIKING CULTURE AS A SUBJECT OF VISUAL ANTHROPOLOGY

The article aims to show the role of traditional Viking culture in visual culture, in the context of its revival and return to modern culture. The object of the research is the Vikings in visual anthropology. In the publication the author refers to scientific and fiction literature, to Internet links featuring the Vikings in visual anthropology, in which the Vikings continue to play a role in photography, film, advertising, and art. This study can serve as a basis for further research.

**Key words:** vikings, visual, anthropology, art, culture, gods, heroes, characters.

Візуальная антрапалогія – частка культурнай антрапалогіі, якая вывучае новую медыйную культуру канца ХХ – пачатку ХХІ ст. Праз новыя сродкі масавай інфармацыі візуальная антрапалогія працягвае даследаваць матэрыяльную і духоўную культуру, а таксама гісторыю культуры, побыту і нораву, якіх прытрымліваюцца народы. Візуальная антрапалогія ставіць перад сабой мэты і задачы: адлюстраваць альбо аднавіць тую культуру, якая знікла некалькі стагоддзяў таму. Напрыклад, у эпоху ранняга Сярэдневякоўя ў Паўночнай Еўропе (Скандынавіі) панавала культура вікінгаў, і праз марскія паходы і набегі на караблях, праз геаграфічныя адкрыцці новых зямель (Грэнландыі і Ісландыі), затым гандлёвыя стасункі і сувязі з культурамі іншых краін распаўсюджвала сваю культуру. Эра вікінгаў існавала з VIII да XI ст. Пасля XI ст. эпоха вікінгаў падыходзіць да завяршэння. Але на сённяшні час, калі мае перавагу навукова-тэхнічная рэвалюцыя, затым ідзе аднаўленне новых медыйных тэхналогій, з дапамогай візуальнай антрапалогіі адраджаюцца малавядомыя культуры, у тым ліку і культура вікінгаў.

Візуальны вобраз – мастацтва, падобнае на адлюстраванне. Даследуючы візуальны свет, амерыканскі тэарэтык мастацтва і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацкі крытык – Джэймс Элкінс спасылаецца на візуальныя даследаванні, якія выступаюць як спосаб пераасэнсавання гісторыі мастацтва. Напрыклад, кіно, медыя, рэклама, фотаздымак з'яўляюцца часткай візуальных даследаванняў [5, с. 7].

Гісторык-мастацтвазнаўца Майкл Бэксандал спасылаецца на тое, што ідэя стварэння візуальнай культуры глыбока сыходзіць у мінулае. Гісторыя візуальнага даследавання пачынаецца з XV ст., адначасова з узнікненнем асэнсавання старажытнасці, якое даследавалі людзі, што цікавіліся гістарычным мінулым сваіх продкаў. У візуальнай культуры вікінгаў даследуюцца іх духоўная і матэрыяльная культура. Напрыклад: у якіх багоў верылі скандынавы, якія насілі адзенні, якой карысталіся зброяй, якія будавалі з дрэва дракары (караблі) [3, с. 124] і г. д. Бэксандал – адзін з першых вучоных, хто спаслаўся на тое, што візуальная культура таксама даследуе генеалагічнае дрэва. Такім чынам, візуальная культура спрыяе даследаванню генеалагічнага дрэва скандынаваў: як герояў, так і дэміургаў. З дапамогай візуальнай культуры гісторыя мастацтва можа ахапіць усе падзеі, што адбыліся ў далёкім мінулым.

Аднак візуальная культура не заўсёды адлюстроўвае рэчаіснасць і тое, што адбывалася насамрэч. Яна больш паказвае ўласныя думкі і выявы чалавека аб мінулым. Паколькі часткай візуальнай культуры з'яўляецца кіно, у фільмах і серыялах аб вікінгах не паказваюць, як выглядаў той ці іншы персанаж у скандынаўскай міфалогіі больш X ст. таму. Акцёры, якія падчас здымак фільма выконваюць ролю герояў-вікінгаў, не могуць цалкам і поўнасцю адлюстраваць як выглядала гістарычная асоба. Яны маюць толькі прадстаўленне аб тым, як выглядаў персанаж, які жыў у эпоху ранняга Сярэдневякоўя.

Скандынаўская міфалогія – частка візуальнай культуры. Многія вікінгі не бачылі па-сапраўднаму пантэон скандынаўскіх дэміургаў. Яны не мелі доказаў таго, што сапраўды існуюць бог вайны – Одзін, грамабой – Тор, багіня любові – Фрэя, бог сонца – Фрэйр, бог вясны – Бальдр, багіня дзетанараджэння – Фрыг, бог агню і падману – Локі і іншыя багі.

Да візуальнага мастацтва вікінгаў адносяцца таксама скандынаўскія руны [1, с.136]. Напрыклад, вікінгі верылі ў тое, што праз руны з скандынаўскімі літарамі можна здзейсніць цуд: аздаравіць хворага, вярнуць паміраючаму чалавеку жыццё і



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

здароўе, калі ён знаходзіцца на мяжы паміж жыццём і смерцю. Альбо з дапамогай рунаў можна было прадбачыць наперад будучыню, і ўбачыць нейкі знак багоў, які прадказвае, што чакае персанажа наперадзе, і што яму наканавана. Празарліўцы, якія мелі дар бачання таго, што будзе потым, выкарыстоўвалі руны. Таксама скандынаўскія руны можна знайсці на амулетах, якія ёсць у продажы. Калі ўбачыць амулет – молат Тора «М'ёльнір» у выглядзе кулона з срэбра з ланцужком, на ім можна ўбачыць тыя самыя руны.

Ёсць і кніжная выстава ў магазінах пра вікінгаў. Як дакументальная, так і мастацкая літаратура, у якіх апавядаецца гісторыя вікінгаўскай эпохі, і таксама ёсць малюнкі мастакоў, на якіх намаляваныя вобразы скандынаўскіх герояў і багоў, якімі мастак іх бачыў у сваім вобразе. Мастацтва – частка візуальнай культуры. У візуальным скандынаўскім мастацтве ёсць выявы, як выглядаюць скандынаўскія дэміургі. Але паколькі ў часы вікінгаў не было фотаапарата і фотаздымкаў, якія б пацвердзілі і даказалі, як той ці іншы персанаж выглядаў насамрэч, кожны мастак прадстаўляе багоў і герояў па-рознаму, у розных абліччах. Тым не менш, богі сталі часткай рэлігійнай самасвядомасці скандынаваў.

У візуальнай свядомасці вікінгаў таксама прысутнічаюць касмагонія і эсхаталогія. У касмагоніі вікінгаў праз візуальную антрапалогію можна ўбачыць сусветнае дрэва «Ігдрасіль», на якім трымаецца скандынаўскі свет. Таксама ў скандынаўскай касмагоніі захавалася прадстаўленне аб стварэнні багамі Одзінам і яго братамі Ві і Велі свету з забітага імі волата Іміра. У эсхаталогіі вікінгаў – адчуванне канца свету, а менавіта дзень апошняй бітвы паміж багамі і волатам – Рагнарок, якая пакладзе канец існаванню цяперашняга свету, усё старое знішчыць і разбурыць, пакуль не адродзіцца новы свет скандынаваў, дзе няма месца для барацьбы і змагання паміж дабром і злом.

Нішчыцелі сённяшняга свету скандынаваў – пачварныя волаты, якія з'яўляюцца ворагамі багоў, адзін з якіх Сурт – волат з палаючым вогненным мячом, што спаліць і знішчыць увесь свет, дзеці бога Локі і волаткі Ангрбоды – воўк Фенрыр (будучы забойца Одзіна) і змей Ярмуганд (злейшы вораг грамабоя Тора), і сам бунтар Локі, які, разарваўшы вяроўкі, вырвецца на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

свабоду, паўстане супраць іншых багоў, і каб адпомсціць за сябе, павядзе за сабой вялізнае войска волатаў. Пакуль Локі знаходзіцца пад зямлёй, прывязаны да скалаў, змяіны яд капае яму на галаву, што выклікае ягоныя невыносныя пакуты і боль, ад якіх у свеце вікінгаў пачынаецца землятрус. Воўк Фенрыр, будучы прыкутым ланцугамі, кожны дзень прадстаўляе небяспеку вырвацца на волю, і для жыцця вярхоўнага бога Одзіна. Грамабой Тор двойчы змагаўся з змеем Ярмугандам, і амаль перамог яго падчас рыбалоўства і марскога падарожжа. Запусціўшы ў галаву змея молатам «М'ёльнір», Тор адпраўляе яго на марское дно, але змей не цалкам пераможаны, і трэцяя сутычка з Торам будзе ўжо апошняй і смяротнай. Нават вікінгі, адпраўляючыся ў марское падарожжа, і здзяйсняючы набегі на суседзяў, асцерагаюцца з'яўлення з дна мора Ярмуганда, які будучы вялізных памераў, можа сваёй пашчай праглынуць іх разам з караблямі [4, с.70]. Калі, напрыклад, перад адпраўленнем у марскі паход на алтар багам не будуць прынесеныя ахвяраванні, і багоў страшна раззлуюць, скандынаўскія ваяры маглі сутыкнуцца з марскім штормам, які разаб'е іх караблі. Альбо яны і іх дракары стануць ахвярамі самога Ярмуганда. Страх вікінгаў перад сустрэчай з змеем пацвярджае, што ён яшчэ жывы і прадстаўляе небяспеку, як і будучы дзень гібелі багоў і свету. Падобныя адчуванні Джэймс Элкінс называе «візуальным адчаем» [5, с.84].

У візуальнай антрапалогіі даследуецца культура вікінгаў праз Інтэрнэт і сацыяльныя сеткі – ВК, facebook, instagram. Напрыклад, па спасылцы ў інстаграме [8] можна знайсці фота і відэа культавага канадска-ірландскага мастацкага серыяла «Вікінгі», знятага Майклам Хёртам. Знакамітыя героі серыяла: нацыянальны герой Скандынавіі і дацкі конунг – Рагнар Лодбрак, яго сыны – Б'ён Жалезнабокі (конунг Швецыі), Хальвдан Вітсэрк, Сігурд Змеявокі, Убба і Івар Бескасцёвы (заваёўнікі англасаксонскіх каралеўстваў), першы конунг аб' яднанай Нарвегіі – Харальд Прыгожавалосы, Флокі Вільгердарсан (адкрывальнік Ісландыі), Эрык Крывавая Сякера (адкрывальнік Грэнландыі), Рольф Пешаход (вікінг, які стаў першым герцагам Нармандыі – Ролла), князь Алег Вяшчун (блізкі сваяк варажскага князя Рурыка, заснавальнік Кіеўскай Русі). Серыял зняты па матывах скандынаўскіх сагаў, у якіх адлюстроў-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ваюцца і гістарычныя падзеі, якія адбываліся ў час панавання вікінгаў. На фота і відэа бачныя акцёры, якія адыгрываюць ролю славутых персанажаў, што ўвайшлі ў скандынаўскую гісторыю. Аднак, паколькі серыял «Вікінгі», як і ўсе фільмы пра вікінгаў зняты праз дзесяць стагоддзяў пасля той эпохі, калі сапраўды жылі вікінгі, не ўсё ў кіно цалкам супадае з рэальнай гісторыяй. Акцёры карыстаюцца не той зброяй і не тым адзеннем у кіназдымках, якімі карысталіся сапраўдныя вікінгі тысячы гадоў таму. Далёка не ўсе гісторыкі ўпэўненыя ў тым, што сапраўды існаваў персанаж Рагнар Лодбрак, які пасля захопу сталіцы Францыі – Парыж у 845 г. і гераічнай гібелі ў англійскім каралеўстве – Нартумбрыя ў 865 г. стаў і па сённяшні дзень з'яўляецца нацыянальным героем Скандынавіі. Для многіх даследчыкаў скандынаўскай міфалогіі і гісторыі Рагнар – міфічны герой. Далей, героі фільмаў пра вікінгаў размаўляюць выключна на сучаснай англійскай мове, паколькі, мовамі рэальных вікінгаў, насамрэч, былі мовы скандынаваў (нарвежская, дацкая, шведская, ісландская). Акцёры імкнуцца быць больш падобнымі на тых персанажаў, ролю якіх яны адыгрываюць, іх знешні выгляд не цалкам супадае з іміджам вікінгаў у эпоху ранняга Сярэдневякоўя. Аднак бясспрэчным фактам застаецца тое, што аднымі з галоўных атрыбутаў у вікінгаў былі барада і доўгія валасы. Са зброі яны карысталіся сякерай і мячом, з якім падчас бітвы паміралі ў руцэ, каб памерці гераічнай смерцю ваяра і патрапіць пасля смерці ў палац вярхоўнага бога вайны і бацькі ўсіх багоў – Одзіна. І як паказана ў кіно, вікінгі сапраўды будавалі з дрэва самыя хуткасныя караблі, і іх караблебудаўніцтва стала часткай матэрыяльнай культуры. Па спасылках ВК [2] і ў facebook [7] таксама можна знайсці фота і відэа з кіно пра вікінгаў. Пасля завяршэння серыяла з шасці сезонаў «Вікінгі» (2013–2020) пра эпоху Рагнара Лодбрака і яго сыноў, з 2021 г. здымаюць серыял «Вікінгі-Вальхалла», у якім апавядаецца пра эпоху вікінгаў пасля Рагнара, і працяг бясконцых войнаў з Англіяй, пакуль праўнук Ролла Нармандскага – Вільгельм Заваёўнік і іншыя нашчадкі нарманаў не захопяць і не падпарадкуюць сваёй уладзе канчаткова Англію. Нягледзячы на некаторыя перабольшванні і памылковыя недахопы ў кіно, візуальная антрапалогія праз кінафільмы імкнецца рэпрэзентаваць гісторыка-культурную спадчыну скандынаваў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Да вывучэння праяў візуальнай культуры ў вікінгаў таксама адносяцца скандынаўскія сцэны, тэатры і танцы. Скандынаўскія фальклорныя гурты, якія з'яўляюцца выканаўцамі музычнага стылю – viking/nordic folk [6]: Heilung, Danheim, Krauka, Les Batards Du Nord, акрамя таго, што адраджаюць скандынаўскі фальклор праз музыку і выкарыстанне тых музычных інструментаў, якімі вікінгі карысталіся ў час сваёй эпохі, таксама вяртаюць спадчыну вікінгаў праз скандынаўскія фальклорныя абрады і сцэнічныя выступы, на якіх выканаўцы, апранутыя ў адзенне вікінгаў, карыстаюцца іх зброяй і імправізуюць на сцэне рытуальныя ахвярапрынашэнні багам. Выкарыстоўваецца на скандынаўскай сцэне па сённяшні дзень рог, з якога раней скандынаўскія ваяры, а зараз іх нашчадкі п'юць эль – напой вікінгаў. На вокладках музычных альбомаў, якія выпускаюць прадстаўнікі вікінгаўскага фальклору, можна таксама ўбачыць вобраз вікінгаў праз візуальную антрапалогію.

Зараз сучасная культура можа быць інтэрпрэтавана як візуальная. Візуальныя даследаванні з'яўляюцца адносна новым кірункам для вывучэння культуры вікінгаў у медыя, у мастацтве і ў паўсядзённым жыцці. Такім чынам, нягледзячы на тое, што пасля прыходу хрысціянства на змену язычніцтву ва ўсёй Еўропе, у тым ліку і ў Скандынавіі, эпоха вікінгаў сышла ў нябыт, візуальная культура ў наш час адкрывае новыя магчымасці даследавання культуры вікінгаў і новыя старонкі ў сучасную эпоху вікінгаў у візуальнай антрапалогіі.

---

*1.* Викинги: Набеги с Севера / пер. с англ. Л. Флорентьева. – М. : Терра, 1996. – 168 с.

*2.* Викинги: Вальхалла [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://vk.com/vikings/. – Дата доступа: 24.06.2022.

*3. Жуков, К.* Викинги. История эпохи: 793–1066 гг. / К. Жуков. – СПб. : Питер, 2021. – 352 с.

*4. Маклеод, Р.* Викинги. Эра воинов и мореплавателей / Р. Маклеод ; пер. с англ. А. Гришин. – СПб. : Азбука Аттикус, 2018. – 80 с.

*5. Элкинс, Д.* Исследуя визуальный мир : пер. с англ. / Д. Элкинс. – Вильнюс : ЕГУ, 2010. – 534 с.

*6.* Viking & Nordic Folk Music [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://vk.com/viking_nordic_folk_music. – Дата доступа: 24.06.2022.

*7.* Vikings – Facebook [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.facebook.com/netflixvalhalla. – Дата доступа: 24.06.2022.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ